







19 па 23 верасня 2023 г. у дзяржаўнай установе адукацыі “Спецыяльная школа-інтэрнат г. Ваўкавыска” праходзіць Тыдзень роднай мовы “Як ты дорага мне, мая родная мова!”. Адкрыццём тыдня для навучэнцаў стала святочная праграма “Мы – беларусы”. Навучэнцы спявалі, танцавалі, чыталі вершы на роднай мове.

Для навучэнцаў былі праведзены разнастайныя пазнаваўчыя мерапрыемствы: "Гульнявы падварак”, ”Скарбы роднай мовы”, “Чароўны клубочак”, “Гучы, родная, мова”. Пры правядзенні гэтага тыдня навучэнцы гулялі ў перакладчыкаў, разгадвалі загадкі і рэбусы на роднай мове, знаёміліся з вядомымі беларускімі пісьменнікамі, прымалі ўдзел у народных беларускіх гульнях.

У бібліятэцы установы адукацыі была арганізавана выстава кніг “Беларускія пісьменнікі дзецям”.

Вялікую цікавасць у вучняў выклікалі беларускія пасядзелкі “Хата ўцехамі багата”, якія прайшлі ў этнаграфічным пакоі “Беларуская хатка”. Вочы вучняў свяціліся радасцю і зацікаўленасцю тады, калі ішло прадстаўленне ў пакоі. Немагчыма, трымаючы ў руках рэчы, выраблены стагоддзе назад, не адчуваць пачуццё гонару за багатую культурную спадчыну.